# Юю















ю



ую́н



юро́к





ю



ю́ка



юна́к




Прачыта́й і паўтары́!

Ую́н ю́ркі ў раку́ ю́ркнуў.

Ю́ркі юро́к па го́ллі скок-паско́к.

У Ю́лі ю́ка, у Кі́ры кро́кус.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

ю́ны юна́к ю́нга ю́ркі ют каю́та Ю́ра Ю́рый

| | | | |
|---|---|---|---|
| ю́ны | ю́нга | ют | Ю́ра |
| юна́к | ю́ркі | каю́та | Ю́рый |

## Ю́нга

Ю́рый — ю́нга. Ю́нга — са́мы ю́ны мара́к. Каю́та — пако́й ю́нгі. Тут чы́ста. Юна́к сам мыў каю́ту.



У Ю́рыя папуга́й Пі́ня.
У Пі́ні паі́лка і корм.
Чу́тны крык папуга́я:
— Пі́ня — матр-р-р-о́с! У Пі́ні я́кар-р-р!

Капіта́н па-клі́-каў ю́нгу на ют.
Ю́нга прыня́ў пост.



Капіта́н:
— Пра́ма! Трыма́й курс на мая́к!
Ю́рый ло́ўкі і спры́-тны.

Ю́нга — ма-лай-чы́-на!

К Й Я Ю



Правообладатель Академия образования










лук



люк

| | |
|---|---|
| лу | лю |
| му | мю |
| су | сю |
| гу | гю |
| пу | пю |
| ну | ню |
| ку | кю |

Гэ́та лук. Стоп! Тут люк!

мус мю́слі

пурга́ пюрэ́

гуса́к гюйс

лю́ты салю́т

лю́-стра лю-стэ́р-ка

Лю́ся Ню́ра



Гэ́та лю́стра.



І гэ́та лю́стра.



А гэ́та люстэ́рка.



У пако́і Лю́сі лю́стра на сто́лі. Каля́ акна́ стол. Там люстэ́рка.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| ю́ны | Ю́ля | юрк | клік |
| юнна́т | Ю́лія | ю́ркнуў | усклі́к |
| юнна́ты | Юлія́на | ю́ркнулі | усклі́кнуў |

## У га́і



Та́та, Ю́ра і Ю́ля гуля́лі ў га́і.

Ю́ра гука́ў Ю́лю, а Ю́ля гука́ла Ю́ру.

Ра́птам та́та паклі́каў Ю́лю і Ю́ру:

— Ю́ра! Ю́ля! У го́ллі асі́ны юркі́!

— Яны́ такі́я малы́я? — спыта́ў Ю́ра.



— Так, — кіўну́ў та́та.

— Які́я яны́ мі́лыя! — усклі́кнула Ю́ля.

Юркі́ ю́ркнулі ў  .

## Юнна́ты



Ю́ра і Ю́ля ста́лі юн-на́-та-мі.
Ю́ра пакармі́ў уюно́ў.
Ю́ля паліла́ ю́ку.



К Й Я Ю



Правообладатель Академия образования